# ЛЮБОЎ ВЯЛА ДА ПЕРАМОГІ

Любоў да зямлі. Гэта яна змушала ратаяў з былін атрэсці сошку і ўзяць у рукі пудовую булаву альбо з каранямі вырваць дуб векавы, каб ачысціць ад нечысці, ад набрыдзі прышлай зямлю-карміцельку, зямлю, дзе спачылі продкі, зямлю, якая роднай стараной завецца.

Гэтая любоў і нянавісць да ворага зрабілі чалавека самай мірнай прафесіі, той прафесіі, якая дбае пра ўраджай, былога выпускніка Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, няўлоўным помснікам, камандуючым буйнейшага партызанскага злучэння, адказным за баявыя дзеянні 16 партызанскіх брыгад, што трымалі пад чырвоным сцягам Савецкай улады тэрыторыю больш за 3 тысячы квадратных кіламетраў.

Уладзімір Елісеевіч Лабанок. З ягоным імем звязаны самыя смелыя і рызыкоўныя вылазкі партызан у стан ворага, нечаканыя рэйды, перамогі ў няроўных баях. А перамагалі маладосць, вера, жалезная дысцыпліна і партызанская кемлівасць.

Прайшоў час. Сёння ў нашай перамогі сталы ўзрост, але дагэтуль у не заўсёды пажаданых для іх саміх успамінах фашысцкіх генералаў, у даследаваннях і манаграфіях, што выходзяць і на Захадзе, і ў Злучаных Штатах, калі разбіраецца стратэгія і тактыка партызанскай барацьбы, абавязкова прыгадваецца прозвішча Лабанка і Ушацкая партызанская зона. Такую ўвагу народныя абаронцы заслужылі канкрэтнымі баявымі справамі.

У тыле ворага, у непасрэднай блізкасці да лініі фронту, да фактычнай лініі абароны 3-й танкавай арміі, едуць чырвоныя абозы з хлебам партызанскага ўраджаю — зусім як у даваенны мірны час. Працуюць кузні. Яны куюць коней, яны куюць сякеры і вілы — прылады, неабходныя ў гаспадарцы, і адначасова зброю селяніна з сівых часін.

На ўсю сваю саматужную магутнасць дымяць смалакурні — трэба змазка для зброі, трэба грымучая сумесь для падрыву танкаў.

У сталярнях і бандарнях зімой дбаюць пра калёсы, летам рупяцца пра сані і пра лыжы-скараходы, пра штурмавыя санкі з мяхамі пяску. Усё для барацьбы, усё для абароны!

У пякарнях пячэцца духмяны партызанскі хлеб. Ён не па зубах ворагу. Сапраўды па прыказцы ўсё выходзіць: на чужы каравай рот не разяўляй!

А калі млыны мелюць зерне, часта скрыгочуць камяні — на зубы ім трапляюць і асколкі, і кулі.

Партызанскія заставы трымаюць чорную раку фашыстоўцаў і іхніх паслугачоў.

Застаў млына трымае раку Ушачу, рака круціць турбіну. Электрычнасць у кожнай хаце. Светла чытаць ушацкую раённую газету «Прымежны калгаснік», лістоўкі і весткі з Вялікай зямлі.

Крылатыя пасланцы прывозяць зброю, боепрыпасы. За лінію фронту вязуць боль — параненых, дзяцей. Нават папяросы з-за фронту ў партызан атрымалі ласкавае імя — «дымок Масквы».

Запалкі — забытая даваенная раскоша. У печках заўсёды жар на дзень

прысыпаецца попелам. Нам, малым падшыванцам, прыемна і адказна несці жарынку ў далонях суседцы ці партызану прыкурыць.

Агонь здабываецца двума спосабамі. Першабытным, яшчэ з каменнага веку: крэсіва высякае іскру, а яна павінна ўспалымніць трут ці вату, змочаную ў бензін.

Альбо партызанска-ўшацкім: у дзве лучынкі (пажадана доўгія) бярэцца вугалёк, лямпачка выкручваецца, а ў патрон устаўляецца вугалёк. На імгненне святло гасне на ўсёй лініі, а ў цемры гарыць вугалёк. Хочаш прыкурвай, хочаш раздзьмухвай агонь у печы.

У прысутнасці дарослых мы не карысталіся ўшацкім метадам здабывання агню. Вось калі перагарыць дэфіцытная лямпачка, валасок устрэсці—калі ласка! Гэта была сапраўдная школа цярпення і загартоўкі нерваў!

Праметэй украў агонь у багоў. Яго прыкавалі да скалы. Міфалогія старажытнай Грэцыі, яна бляднее перад партызанскай суровасцю і рамантыкай рызыкі. Не ў тумане даўніны грымелі кузні, дзе выплаўлялася тол са снарадаў і авіябомбаў, што не ўзарваліся.

Мне і зараз помніцца пах марганцоўкі і прыкарэлых да ран бінтоў: бацька з перадавой прыйшоў на кароткую пабыўку. Выплаўлялі тол—апаліла твар і рукі.

Уладзімір Елісеевіч нядаўна тлумачыў, як здабывалі партызаны той гром, што скалануў зямлю, пад адхон пускаў варожыя эшалоны. У кузні адзін раздзімае горан, а другі абцугамі трымае снарад. Як толькі тол пачынае плавіцца, трэба хутчэй выліваць. Галоўнае, паспець! Бацька тады не паспеў.

Успамінае Уладзімір Елісеевіч у сваіх кнігах * цёплым словам, з ласкавай усмешкай «кішанёвую артылерыю» партызан—гранаты: ПГ (партызанская граната), ПРГ (партызанскі гранатамёт).

У тых жа кузнях народныя помснікі рабілі са звычайных гранат супрацьтанкавыя: дадаткова наварваўся кожух з бляхі, які напаўняўся толам.

* У. Е. Лабанок. «У баях за Радзіму», Мінск. «Беларусь», 1964. «Партызаны прымаюць бой», Мінск. «Беларусь», 1976.

На ўліку былі кожны патрон, кожны снарад. Чака з «лімонкі» вырывалася ў самы апошні і крытычны момант. А калі нечакана небяспека мінала, то «лімонку» трымалі ў руцэ і потым перавязвалі аборкай ці суровымі ніткамі. Толькі адчайны мог ісці спакойна з такой зброяй. Здараліся і сумныя вынікі.

У азёрным краі спецыяльныя рыбалавецкія брыгады забяспечвалі партызан рыбай.

У Кіева-Пячэрскай лаўры ў трапезнай на сцяне намаляваны святы, які лавіў рыбу для Лаўры.

Партызанскія мастакі М. Абрыньба, В. Грамыка, М. Гуціеў не намалявалі ніводнага святога з вінтоўкай, які рыбай партызан карміў. Яны не паспявалі рабіць партрэты лепшых снайпераў, лепшых падрыўнікоў, камісараў, камбрыгаў. Рабілі яны і вострыя на слова і на выяву плакаты. Партызаны ўмудрыліся мабілізаваць на барацьбу з ворагам нават даўнюю забаву дзяцей—папяровы змей. Звычайна ў Лепель і ў іншыя нямецкія гарнізоны ноччу з падветранага боку запускалі «змея» з лістоўкамі, з плакатамі.

Навагоднія елкі ў партызанскай зоне! Дагэтуль Дзед Мароз здаецца мне разведчыкам у маскхалаце. Дагэтуль ялінкі ў лесе пасля лагоднага снегападу ў маскхалатах ідуць на заданне, а летам утуманеныя кусты таксама пра маскхалаты партызан напамінаюць.

Кароткімі зімовымі днямі і доўгімі вечарамі, запяўшы вокны ад злога вока нямецкіх самалётаў, шыла мама мая—да вайны лепшая краўчыха—маскіровачныя халаты для партызан. І сёння чуваць мне бяссонны строкат швейнай ручной машынкі ў марознай начы.

І зіма, і снег спрыялі партызанскім разведчыкам, снайперам, падрыўнікам.

У музеі ў Мінску на выстаўцы Мікалая Рэрыха мне запомніліся ягоныя партызаны ў маскхалатах. У далёкай Індыі, здалося мне, убачыў стары рускі мастак партызан з азёрнага краю, з трывожнай і няскоранай партызанскай рэспублікі.

Партызанскі край быў заўсёды напагатове. Чуйнасць і пільнасць так-


ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



Партызанская пякарня.



На трывожным аэрадроме.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



М. Абрыньба запускае змея з лістоўкамі ў варожы гарнізон.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



Купанне партызанскай кавалерыі.

сама былі зброяй, асабліва пры смелых аперацыях. «У партызан моцна зяблі ногі, але стукаць валёнкамі ў насцярожанай лясной маўклівасці забаранялася,— зазначае Уладзімір Елісеевіч у кнізе...— Партызаны не адназначалі прыход сорак чацвёртага салютамі: трэба было берагчы патроны».

Зімой 1944 года У. Е. Лабанка выклікалі ў Маскву — у ЦК Кампартыі Беларусі і ў Беларускі штаб партызанскага руху. Нялёгка было прабівацца самалёту праз агонь варожых зенітак. Унізе ляжала прыціхлая Ушаччына, прыціхлая, але не ціхая, не скораная, гатовая ў любы момант пачаставаць акупантаў свінцом.

Самалёт прарваўся на Вялікую зямлю. Нарэшце, Масква!

У. Е. Лабанок піша:

«На пероне Беларускага вакзала мая скуранка, белая баранняя кубанка (шык партызанскай моды) ды, вераемна, і ўвесь мой знешні воблік адразу ж прыцягнуў увагу маёра ваеннай камендатуры. Ён падышоў да мяне.

— Адкуль, грамадзянін?

— З лесу!

— Дакументы.

Я паказаў пасведчанне, заверанае самаробнай пячаткай.

— І гэта ўсё?— запытаўся ён, вяртаючы дакумент і з цікаўнасцю разглядваючы маю, па партызанскіх паняццях, шыкоўную кубанку.

Ніякіх іншых дакументаў у мяне, натуральна, не было. Раптам маёр заўважыў калодку маўзера, што вытыркнулася з-пад крыса маёй скуранкі. Усміхнуўся:

— У партызан гэтая гармата яшчэ стаіць на ўзбраенні?

— Паболей бы нам такіх гармат!»

У Маскве была вучоба. Там жа, у Маскве, распрацоўваўся канкрэтны план захопу партызанамі горада Лепеля. У. Е. Лабанок унёс самыя канкрэтныя прапановы. Пасля па гэтаму плану партызаны двойчы ўрываліся ў цэнтр Лепеля, наводзячы жах на варожы гарнізон.

Кожная хвіліна была дарага Уладзіміру Елісеевічу — чакала партызанская зона. Былы сакратар райкома партыі прывык адказваць за свой участак працы, куды б ні накіравала яго партыя.

З Масквы таварыш Лабанок ляцеў з «Залатой Зоркай» Героя Савецкага Саюза, у новай вайсковай форме з пагонамі палкоўніка.

Сержаноўскі аэрадром прыняў упаўнаважанага ЦК Кампартыі Беларусі і начальніка аператыўнай групы У. Е. Лабанка і некалькі афіцэраў. Аператыўная група (у яе ўвайшлі падпалкоўнік А. І. Бруханаў, маёр А. Ф. Бардадын, капітан І. І. Зіненка, капітан Д. А. Фралоў) павінна была каардынаваць усе дзеянні партызанскіх брыгад зоны.

Дарэчы, пасведчанне сваё прад'яўляць і сцвярджаць даставеру асобы Уладзіміру Елісеевічу давялося і ў партызанскай зоне. Расказвае пра самыя цяжкія дні блакады. Між Сарочыным і Арэхаўнам (гэта каля самых Ушач) едзе на возе дзед, сумны, разгублены, знявераны.

— Чаму так галаву апусціў?— запытаў Уладзімір Елісеевіч у старога.

— А, дрэнь справа. Немцы блізка, а Лабанок ужо на самалёце паляцеў.

— Лабанок перад табой. Вось я.

Паверыў дзед толькі тады, калі пасведчанне ўбачыў. Павесялеў.

Партызаны звычайна пакідалі пазіцыі толькі ў адным выпадку, калі сыходзілі боепрыпасы. Часта ў часе бою і ўзбройваліся і боезапасы здабывалі.

Уладзімір Елісеевіч помніць, як партызаны ўкралі гармату з-пад носа ў немцаў каля самага гарнізона. З яе ж і абстралялі Лепель — гняздо немцаў, паліцаяў. Гэта было ў 1943 годзе. Адзін снарад трапіў у рэстаран, дзе бавіла ноч нямецкае афіцэрства. Пачалася паніка. Партызаны ў горадзе!

Партызанская кемлівасць памагала ў самых безвыходных становішчах.

Ранняй вясной 1943 года група партызан брыгады Дубава пад камандаваннем У. Е. Лабанка зрабіла глыбокі рэйд у Літву. Пасля прарыву блакады Ленінграда немцы кінулі на поўнач болей тэхнікі і жывой сілы. Трэба было зрываць перавозкі, паралізаваць камунікацыі. За час рэйду партызаны разбілі 8 гарнізонаў ворага, знішчылі два эшалоны, звыш 250 гітлераўцаў. Чутка пайшла, што рухаецца дэсант Чырвонай Арміі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



Камбрыг Ф. Ф. Дуброўскі і У. Е. Лабанок на баявых пазіцыях. 1942 г.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



Пачатак блакады.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы